**Існуе меркаванне: студэнт лічыцца "сапраўдным" тады, калі пажыў у інтэрнаце. І ў кожнага, хто спазнаў там першыя складанасці, ёсць сваё ўяўленне, што ж такое інтэрнацкае жыццё. Нават улічваючы "мінусы" такога сумеснага пражывання, усе пагодзяцца: для студэнта месца ў інтэрнаце — вялікая дапамога. Іншая справа, што студэнту, тым больш ВНУ культуры і мастацтваў, хочацца вяртацца з заняткаў ва ўтульны пакой, дзе не абсыпаецца столь, ёсць гарачая вада і іншыя выгоды.**

# Студэнцкі інтэрнат: здаць экзамен на "дзесятку"



Напярэдадні новага навучальнага года карэспандэнт "К" наведаў інтэрнаты Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Першае, у чым давялося пераканацца: апошні тыдзень жніўня — традыцыйна час доўгіх чэргаў ва універсітэцкіх інтэрнатах, бо іншагароднія студэнты засяляюцца ў выдзеленыя ім пакоі.

### 90 для 65

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў вылучаецца сярод айчынных ВНУ ці не самым максімальным забеспячэннем сваіх студэнтаў месцамі ў інтэрнатах. Гэтаму спрыяе і тое, што колькасць іншагародніх не перавышае 65 працэнтаў. У цэлым, сёлета засяліцца ў інтэрнат змогуць больш за 90 працэнтаў студэнтаў, што маюць у гэтым патрэбу. І ў першую чаргу — усе тыя, хто пераадолеў першы курс навучання. Больш складаная сітуацыя з першакурснікамі, месцы якім выдзяляюцца толькі пры наяўнасці льгот. Так, выхаванцы дамоў-інтэрнатаў, маладыя сем'і, інваліды з дзяцінства, дзеці з малазабяспечаных сем'яў і некаторыя іншыя катэгорыі грамадзян могуць разлічваць на пражыванне ў інтэрнаце на працягу ўсяго тэрміну навучання. Таксама, па словах першага прарэктара БДУКіМ Юрыя Бондара, існуе практыка абмену інтэрнацкіх месцаў паміж універсітэтамі для сумеснага пражывання маладых сем'яў і блізкіх родных.

Сёлета для 1600 студэнтаў БДУКіМ інтэрнаты традыцыйна добраўпарадкаваліся. З ліпеня і да пачатку новага навучальнага года там праводзіліся планавыя работы па касметычным, бягучым і капітальным рамонце. Яшчэ летась былі праведзены работы ў інтэрнаце № 2, пад час якіх уцяпляліся тарцовыя фасады, замяняўся дах, згодна патрабаванняў па стварэнні без-бар'ернай зоны для інвалідаў рэканструявана ўваходная група. Сёлета падобныя работы праводзяцца і ў інтэрнаце № 1.

Як падкрэсліў Юрый Бондар, вялікую дапамогу ў прывядзенні да ладу інтэрнатаў аказала летняя студэнцкая брыгада, якая займалася дробным рамонтам унутраных памяшканняў. Першы прарэктар кажа, што інтэрнаты БДУКіМ у сярэдзіне жніўня былі праінспектаваны камісіяй Кастрычніцкага раёна Мінска ў складзе прадстаўнікоў мясцовай адміністрацыі, санэпідэмстанцыі, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, пашпартна-візавай службы і дапушчаны да эксплуатацыі. Юрый Бондар лічыць, што сёння сітуацыя з падрыхтоўкай інтэрнатаў да новага навучальнага года істотна палепшылася, бо яшчэ гадоў дзесяць таму МНС давала прадпісанне, што ўключала больш за сорак пунктаў, а зараз абмяжоўваецца толькі пажаданнямі. І гэта, у першую чаргу, дзякуючы ўвазе Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, якое выдаткоўвае універсітэту сродкі на ліквідацыю пэўных тэхнічных пытанняў, прывядзенне інтэрнатаў у адпаведнасць з пажарнымі і санітарнымі нормамі. Як вынік — выключна эпізадычныя заўвагі правяраючых органаў, што імгненна ўлічваюцца.

Сёння любая праектная дакументацыя ва універсітэце прадугледжвае распрацоўку Палажэння па энергазберажэнні. Такім чынам, паступова адбываецца замена электраабсталявання, уцяпленне сцен і даху, вокнаў інтэрнатаў, што, безумоўна, станоўча адбіваецца на студэнтах, якія цэлы год могуць жыць і вучыцца ў цёплых і ўтульных памяшканнях.

### Які студэнт без трэнажорнай залы?

Гэтае рытарычнае пытанне даволі вострае ў сценах БДУКіМ, які не мае ўласнага спартыўнага цэнтра. І ўсё ж зрухі ў гэтым плане ёсць. Праектаванне культурна-спартыўнага комплексу было распачата яшчэ ў 2001 годзе. Пад час наведвання навучальнай установы Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка даручыў стварыць сучасны якасны аб'ект як для заняткаў па фізічнай культуры, так і для прафесійных трэніровак і, зразумела, канцэртных выступленняў студэнтаў.

На сённяшні дзень абрана падрадная арганізацыя, якая з верасня пачне работы па падрыхтоўцы будаўнічай пляцоўкі на месцы будучага аб'екта. Тэрмін будаўніцтва мусіць скласці 30 месяцаў, і, па меркаванні Юрыя Бондара, ёсць усе падставы спадзявацца, што нават у 2010 годзе культурна-спартыўны комплекс будзе ўведзены ў эксплуатацыю ў поўным аб'ёме. Дарэчы, праект комплексу ўваходзіць у дзесятку лепшых праектаў, распрацаваных у інстытуце "Белпраект" за апошнія гады, ён неаднаразова станавіўся лаўрэатам розных конкурсаў.

Сапраўды, планы грандыёзныя. У прыватнасці, мяркуецца, што універсальная зала стане сучасным будынкам каркаснага тыпу, дзе будзе размешчана вялікая спартыўная зала з арэнай і трыбунамі на 850 гледачоў. Пры неабходнасці яна можа хутка трансфармавацца ў канцэртную пляцоўку: будзе створана рухомая сцэна, а ў партэры — месцы для дадатковых крэслаў, што дазволіць прыняць больш за 1200 аматараў мастацтва.

Паводле праекта разлічана будаўніцтва і малой спартыўнай залы для трэніровак па баскетболе, а таксама заняткаў фізкультурай з невялікімі групамі. Будуць тут і танцавальная зала, буфет ды іншыя аб'екты, неабходныя для забеспячэння культурнага і спартыўнага жыцця студэнтаў. Сучаснае абсталяванне, у тым ліку асвятляльнае і гукавое, наяўнасць кандыцыянераў — усё гэта будзе садзейнічаць праяўленню студэнтамі сваіх здольнасцей.

Праблема наяўнасці памяшканняў для спорту і канцэртных выступленняў надзвычай актуальная не першы год. Справа ў тым, што першапачаткова ўся матэрыяльна-тэхнічная база універсітэта належала бібліятэчнаму факультэту тагачаснага педінстытута, з якога ён і быў утвораны. Таму пры ўзвядзенні вучэбнага корпуса стварэнне спартыўных аб'ектаў і нават актавай залы не планавалася, у выніку чаго БДУКіМ пакуль арандуе стадыёны ў іншых універсітэтаў і прадпрыемстваў для забеспячэння студэнтаў у гэтай сферы.

### Мастакі ў фешэнебельных нумарах

У сваю чаргу, жыллёва-бытав. службы Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, дзякуючы мінулагодняму капітальнаму рамонту інтэрната, гэтае лета правялі ў даволі спакойным графіку і абмежаваліся касметычнымі работамі і добраўпарадкаваннем тэрыторыі вакол інтэрната. Пад час леташняга рамонту адбылася надбудова жылога і мансарднага паверхаў. На апошнім, пятым, размясціліся творчыя майстэрні мастацкага факультэта Акадэміі. Была зроблена і перапланіроўка пакояў. Так, калі раней інтэрнат быў калідорнага тыпу, то цяпер стаў блочнага, у выніку чаго, на радасць студэнтаў, дадаліся кухні, душавыя кабіны, пральня, а самі пакоі зараз разлічаны як на тры, так і на два, і нават на аднаго чалавека. Усяго, па словах начальніка аддзела выхаваўчай работы БДАМ Тамары Шаўчук, сёлета атрыма месцы ў інтэрнаце 195 чалавек.

Што да месцаў актыўнага адпачынку жыхароў інтэрнатаў, то сёння Акадэміяй толькі шукаецца адпаведнае памяшканне для трэнажорнай залы, бо ранейшае, падвальнае, у сувязі з перапланіроўкай ужо не прыдатнае для спартыўных трэніровак.

### Настроіцца на музыку

Падрыхтаваныя інтэрнаты чакаюць студэнтаў і Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Сёлета там быў праведзены касметычны рамонт кухонных памяшканняў і некаторых паверхаў, заменена бойлерная ўстаноўка ў падвале і, самае галоўнае, адбылася доўгачаканая ўстаноўка трох новых ліфтаў. Паводле зацверджанага кіраўніцтвам Акадэміі плана былі заменены і некаторыя водаправодныя камунікацыі, сантэхніка. У бліжэйшай перспектыве — замена газавых пліт на электрычныя, што дазволіць інтэрнату адпавядаць усім нарматыўным патрабаванням.

Як зазначыла загадчыца інтэрната Акадэміі музыкі Варвара Касько, сёлета прыкладна 101 першакурснік, а таксама 10 магістрантаў змогуць атрымаць месцы ў інтэрнаце, як, дарэчы, і ўсе астатнія іншагароднія студэнты, для якіх створаны спрыяльныя ўмовы як для пражывання, так і для спартыўнага самаўдасканалення ў спецыяльна абсталяванай для гэтага зале.

**Канстанцін АНТАНОВІЧ**

Прэм'ера рубрыкі: "Дзяжурны па нумары"

# Творца без... твораў?

**Усё больш дакладна разумею: рабіць падарункі — няпростая навука. Асабліва калі гэта не проста падарунак, а даніна памяці. Усё ж правільна заўважана псіхолагамі: тое, што мы робім у гонар людзей, якія пакінулі гэты свет, ужо робіцца не столькі для іх, колькі для сябе...**

**Тыдзень таму адразу пасля цырымоніі адкрыцця мемарыяльнай дошкі народнаму артысту Беларусі Юрыю Семяняку ў рэдакцыю пачалі тэлефанаваць узрушаныя калегі знакамітага кампазітара, да глыбіні душы пакрыўджаныя тым, як прайшла ўрачыстасць. Усё было, здавалася б, узнёсла і натхнёна, гучаў Дзяржаўны гімн нашай краіны, высокія словы прызнання творчых і грамадскіх заслуг Юрыя Семянякі, цёплыя ўспаміны. А ў канцы, як і належыць, зайграла музыка. Гэта было... Адажыо з балета "Маленькі прынц" Яўгена Глебава.**

**Арганізатары нават не адразу зразумелі збянтэжанасць прысутных: ціхая, сумная мелодыя, на іх думку, вельмі пасавала сітуацыі. А твораў самога Семянякі яны, маўляў, не знайшлі. Ну што тут скажаш! Можна, пэўна, узгадаць, як многа ягоных запісаў захоўваецца ў фондах Беларускага радыё. Лёгка знайсці нядбайнага супрацоўніка, які "запароў" справу. Толькі ці прынясе гэта жаданы вынік? Бо сутнасць з'явы — куды больш глыбінная. Дый сам выпадак далёка не адзінкавы.**

**Памятаю, з якой разгубленасцю я глядзела, да прыкладу, дакументальную відэастужку пра беларускага мастака, музыканта і кампазітара Напалеона Орду. Ішоў цікавы аповед пра яго жыццё і творчасць, паказвалася мноства ягоных пейзажаў — і ўсё гэта на фоне музыкі вядомых заходнееўрапейскіх кампазітараў. Не было толькі твораў самога Орды! "А што, хіба гэтыя запісы дзесьці ёсць?" — у адказ здзівіліся ўдзельнікі праекта. І ў чымсьці яны мелі рацыю. Бо наяўнасць запісаў не азначае іх агульнадаступнасці.**

**Быў час, калі пра дзейнасць многіх славутых людзей Беларусі, асабліва мінулых стагоддзяў, ведалі хіба спецыялісты адпаведнай галіны мастацтва. Наступным крокам на шляху нацыянальнай свядомасці стала папулярызацыя іх імёнаў. Але ж як часта, вымаўляючы знаёмае спалучэнне літар, мы амаль нічога не ведаем пра самога творцу і, галоўнае, не ведаем яго твораў!**

**З Юрыем Семянякам, здавалася б, усё іначай. Па меншай меры, дзве ягоныя песні сталіся абсалютнымі хітамі — "Явар і каліна" і "Ты мне вясною прыснілася". Вядомасць зрабіла іх папраўдзе народнымі, калі пра аўтараў пачынаеш забываць. Але ж ці трэба? Бо лепшае ўшанаванне памяці творцаў — гэта папулярызацыя іх твораў. Пагадзіцеся: калі б творы Юрыя Семянякі гучалі часцей, апісанае наўрад ці магло б здарыцца.**

**Надзея БУНЦЭВІЧ**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ